*Зябкіна Г. М.*

# ВЫКАРЫСТАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў БІБЛІЯТЭРАПІІ

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Ратынская Н. В.***
***Кафедра беларускай і рускай моў***
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Бібліятэрапія – метад псіхатэрапіі , які выкарыстоўвае спецыяльна падабраную мастацкую літаратуру як адну з формаў лячэння словам у мэтах нармалізацыі ці аптымізацыі псіхічнага стану чалавека. Правільна падабраная літаратура можа дапамагчы зняць стрэс, вылечыць неўрозы, дапамагчы псіхічным хворым ці проста падняць настрой.

**Мэта:** даследаваць магчымасць і эфектыўнасць выкарыстання беларускай літаратуры ў бібліятэрапіі.

**Матэрыял і метады.** У ходзе даследавання было прааналізавана шмат артыкулаў, выдзелены асноўныя прынцыпы дзеяння бібліятэрапіі. Праведзена сацыяльнае апытванне сярод студэнтаў, якое змяшчала наступныя пытанні:

1) Ці чытаеце вы беларускую літаратуру ў вольны час?
2) Якой па гучанні з’яўляецца для вас беларуская мова (заспакаяльнай, прыгожай, грубай, меладычнай)?
3) Чаму вы аддаяце перавагу: прозе ці вершам?
4) Укажыце некалькі твораў і іх аўтараў з беларускай літаратуры, якія запомніліся вам больш за ўсё.

**Высновы:**

1. Творы беларускай літаратуры можна выкарыстоўваць для правядзення бібліятэрапіі.
2. Амаль што 40% апытаных студэнтаў чытаюць беларускую літаратуру ў вольны час.
3. Больш за 70% апытаных лічаць беларускую мову меладычнай і прыгожай; 40% з іх называюць яе заспакаяльнай. І толькі 18% лічаць родную мову грубай.
4. Для правядзення бібліятэрапіі можна выкарыстоўваць такія творы, як “Сэрца на далоні” Івана Шамякіна, творы Васіля Быкава (“Знак бяды”, “Жураўліны крык”), “Палескія рабінзоны” Янкі Маўра, “Палеская хроніка” Івана Мележа, творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і іншыя.

Репозиторий БГМУ